# ТРЫ ПРЫЧЫНЫ, ЧАМУ ГЭТЫМ ЛЕТАМ ВАРТА НАВЕДАЦЬ БРАСЛАЎШЧЫНУ

***У Беларусі ёсць мноства цудоўных месцаў, дзе абавязкова трэба пабываць кожнаму. Адно з такіх – Браслаўшчына. Гэта адзін з самых прыгожых курортных цэнтраў нашай краіны, які зачароўвае сваёй прыродай і бяздоннымі блакітнымі азёрамі. А лепшы час для адпачынку – гэта, вядома ж, лета. Я вырашыла расказаць, чаму, на маю думку, трэба прыехаць улетку на Браслаўшчыну. Не буду распавядаць пра незлічоную колькасць азёр, прыгажосць, што адкрываецца з Замкавай гары і г.д. Гэтую інфармацыю можна лёгка знайсці ў сеціве ці ў турыстычных даведніках. Лепш я адзначу тыя прычыны, якія ведаюць толькі мясцовыя жыхары.***






### САМЫ КРУТЫ ФЕСТЫВАЛЬ

Viva Braslav Open Air – адзін з самых маштабных фестываляў нашай краіны, які штогод праходзіць летам пад адкрытым небам на гарадскім пляжы Браслава. Гэта сапраўднае свята музыкі і спорту, куды прыязджаюць самыя папулярныя спевакі: Макс Барскіх, Ціма Беларускіх, Арцём Півавараў, Скруджы, Ляпіс Трубяцкі і іншыя. У гэтым годзе Браслаў таксама будзе сустракаць вядомых артыстаў з розных краін: Zivert, MATRANG, ЛСП, Apashe, Bassjackers, Julian Jordan, Dyro.

А для аматараў спорту арганізатары свята прапануюць розныя спартыўныя гульні: пляжны футбол, валейбол, тэніс, гонкі на сапсёрфінгу і многае іншае.

Акрамя таго, у рамках фестывалю дзяўчаты ва ўзросце ад 18 да 28 гадоў змогуць прыняць удзел у Нацыянальным конкурсе прыгажосці Miss Viva Braslav 2020.

Для тых, хто не ведае, дзе спыніцца падчас свята, ёсць спецыяльна абсталяваная зона кемпінга.

Калі вы хочаце атрымаць зарад аптымізму і бадзёрасці на цэлы год, то прыязджайце 24 – 25 ліпеня 2020 года на галоўны ўікэнд краіны – Viva Braslav Open Air.

### ЦУДОЎНЫ АДПАЧЫНАК

Адно з самых маляўнічых месцаў, дзе можа спыніцца турыст, – гэта база адпачынку «Краснагорка». Яна размешчана на беразе аднаго з самых прыгожых і буйных азёр Беларусі – Снуды. Тут можна пасапраўднаму адпачыць ад гарадской мітусні і атрымаць асалоду ад незвычайнай браслаўскай прыроды.

«Красначорка» – месца, дзе кожны знойдзе сабе занятак па душы. Так, для аматараў актыўнага адпачынку на тэрыторыі базы ёсць адзіная ў Беларусі пляцоўка для футгольфа.

Для тых, хто хоча пазагараць на сонейку і правесці час на возеры, абсталявана спецыяльная пляжная зона з ляжакамі і парасонамі. Тут жа кожны жадаючы можа ўзяць напракат байдарку, лодку або катамаран.

Папарыцца і атрымаць асалоду ад водных працэдур можна ў сапраўднай беларускай лазні і кедравай бочцы.

Многія людзі любяць жывёл, але не ў кожнага дома яны ёсць. На базе адпачынку «Красногорка» знаходзіцца хатняя ферма, дзе турысты могуць назіраць за жыццём жывёл і, вядома ж, пакарміць іх прысмакамі. Я ўпэўнена, што дзеці і дарослыя будуць у захапленні, напрыклад, ад сабакі Мары.

Адпачынак на базе «Красногорка» заўсёды пакідае толькі лепшыя ўспаміны.

### МУЗЕІ НА ЛЮБЫ ГУСТ

Усе музеі вам здаюцца сумнымі і аднастайнымі? Тады вам трэба наведаць «Музей ката Брасіка», які знаходзіцца ў вёсцы Данькі.

На тэрыторыі музея – сапраўдны «кацiны рай»: тут можна знайсці разнастайныя цікавыя экзэмпляры, пачынаючы ад драўляных фігурак катоў да лялек з тканіны. Прычым, кожны кот – са сваёй гісторыяй і непаўторным характарам. А на памяць аб гэтым выдатным месцы можна набыць невялікі сувенір.

Тым жа, хто захапляецца гісторыяй, абавязкова трэба наведаць Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей. Ён складаецца з шасці залаў, якія адрозніваюцца паміж сабой па тэматыцы.

У адной можна паглядзець экспанаты, якія былі знойдзены пры археалагічных раскопках, напрыклад, ушэбці (егіпецкую статуэтку, якую клалі ў грабніцу).

Таксама ў музеі можна падрабязней даведацца пра Браслаўшчыну часоў Вялікай Айчыннай вайны: пра дзейнасць падпольных арганізацый, знішчэнне габрэйскага гета і г.д.

У музеі ёсць і этнаграфічны аддзел, у якім можна пабачыць мэблю і прадметы XIX – пачатку XX стагоддзя. А напрыканцы экскурсіі вас будзе чакаць сюрпрыз. Духмяны чай з браслаўскіх траў нікога не пакіне раўнадушным!

Кожны турыст абавязкова павінен наведаць і Браслаўскі музей традыцыйнай культуры. Тут можна ўбачыць мноства цікавых рэчаў, якія зроблены сваімі рукамі, і самому паўдзельнічаць у розных майстар-класах.

Вы даведаецеся гісторыю і сакрэты ткацтва, ганчарства і разьбы па дрэве, якія існуюць на Браслаўшчыне. А ўсіх жадаючых тут навучаць любому з прапанаваных рамёстваў.

Таксама ў музеі можна паглядзець розныя выставы браслаўскіх фатографаў, мастакоў і майстроў.

*Правядзіце гэтае лета весела і з карысцю! Браслаўшчына чакае вас!*

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота аўтара.**